*Дадатак*

## Апорны канспект

***Параўнальны зварот*** *– гэта слова ці словазлучэнне, якое праз параўнанне раскрывае ці канкрэтызуе змест іншых членаў сказа з дапамогай злучнікаў нібы, што, як, як бы, быццам, як быццам, усё роўна як, чым. Параўнальны зварот у сказе часцей за ўсё з'яўляецца акалічнасцю спосабу дзеяння і адказвае на пытанне як. Параўнальны зварот можа стаяць у пачатку сказа, у сярэдзіне і ў канцы.*

| Коскамі выдзяляюцца | Коскамі не выдзяляюцца |
|---|---|
| **1** Толькі параўнальнае значэнне:<br>*Вясною падалі пялёсткі, нібы сняжынкі, на мурог.*<br>*Як стрэлы, носяцца ластаўкі над вадою.*<br>*Жыццё шуміць, як гай зялёны.*<br>**2** Указальнае слова **так, такі + як:**<br>*Дзед пазіраў так, як дзікі арол.*<br>*І дзе на свеце ёсць такая, як Нёман, рэчанька другая.*<br>**3 Перад ЯК:**<br>***не хто іншы, як; не што іншае, як;***<br>***як правіла, як звычайна; як знарок,***<br>***як заўсёды, як цяпер,***<br>***як ніколі і інш.:***<br>*Алесь падумаў, што гэта не хто іншы, як сам кіраўнік падполля.*<br>*Каля магазіна, як заўсёды, збіраюцца вяскоўцы.*<br><br>***Узор разважання:***<br>Дзяўчаты, як русалкі, карагоды водзяць.<br><br>*– У гэтым сказе ёсць параўнальны зварот са злучнікам як (дзяўчаты параўноўваюцца з русалкамі).*<br>*– Падкрэсліваю дзейнік і выказнік (дзяўчаты карагоды водзяць).*<br>*– Гэты параўнальны зварот (як русалкі)*<br>*1) не ўваходзіць у склад выказніка;*<br>*2)не фразеалагізм;*<br>*3) не ў значэнні “ў якасці”;*<br>*4) пры ім няма часціц не, ні, прыслоўяў амаль, зусім;*<br>*5)няма паўтору;*<br>*6) гэта не ўстойлівы выраз;*<br>*– Значыць, яго выдзяляю з двух бакоў коскамі.* | **1** Параўнанне **- іменны выказнік:**<br>*Жыта як сцяна. Лясныя сцяжынкі што павуцінкі*<br>**2** Параўнанне **– фразеалагізм:**<br>*Лукашык прыліп як смала і не адыходзіў.*<br>*Дождж ліў як з вядра.*<br>*У лес мяне цягнула як магнітам*<br>Галодны як воўк; злы як сабака; белы як снег (палатно); моцны як дуб; біцца як рыба аб лёд; усе як на падбор; чырвоны як рак; як кот наплакаў; баяцца як агню і інш.<br>**3** *Спалучэнні* ***больш як (не больш як), не часцей як, не іначай як, менш як, менш чым, не радзей як, не далей як, не бліжэй як, усё роўна як і інш.,*** *якія выражаюць* ***абмежаванне ў прасторы, часе і колькасці:***<br>*Паеду не больш як на тры дні.*<br>*Ён заходзіў не часцей як адзін раз на тыдзень.*<br>*Хлопец усё роўна як гарадскі артыст.*<br>**4** ***Не, ні, амаль, зусім*** + **як**+параўнанне:<br>*На пытанні Максім адказваў зусім як дарослы.*<br>*Андатра ўмывалася амаль як чалавек. Хлопец паводзіў сябе далёка не як герой.*<br>**5 Як** у значэнні ***«ў якасці»:***<br>*Яго ведалі як чалавека з фантазіяй.*<br>*Водарасці выкарыстоўваюцца як прадукт харчавання.*<br>**6** Пры **паўторы** слоў:<br>*карта* ***як*** *карта, дзяўчына* ***як*** *дзяўчына.*<br>**7** *Устойлівыя выразы са злучнікам як :* ***як мага, як след, як мае быць, як належыць, як не ў сабе і інш.***<br>*Трэба як належыць рыхтавацца ў дарогу.*<br>*Да экзамену трэба рыхтавацца як мае быць.*<br>*Падлога мыецца як след.* |